ПАДЗЕЯ Источник: "Голас Радзімы" - 2012-12-13

# Друкаваныя скарбы растуць у цане

## Пад час Каляднага дабрачыннага балю кнігі лепшыя выданні з Беларусі, а таксама Расіі, Украіны, Казахстана можна было набыць на аўкцыёне. Прычым кошт некаторых з іх узрастаў у дзясяткі разоў.

Іван Ждановіч



ІВАН ЖДАНОВІЧ

Анатоль Статкевіч-Чабаганаў ушанаваны на балі як "Мецэнат кнігі"

"Калядны дабрачынны баль кнігі ў Год кнігі" — такая імпрэза ўпершыню ладзілася ў Доме Масквы ў Мінску. Ва ўтульнай зале былі прадстаўлены выстаўленыя на аўкцыён выданні, гучала музыка, у тым ліку і творы вядомага мастака і кампазітара Напалеона Орды. Кавалеры і дамы ў старадаўніх строях дапамагалі гасцям акунуцца ў атмасферу даўніны. Усе маглі зарэгістравацца, атрымаць як прыгожы каталог выстаўленых на продаж выданняў (28 лотаў), так і карткі-нумары для ўдзелу ў таргах.

Такі аўкцыён ладзіўся ў Беларусі ўпершыню. Можна было набыць, напрыклад, унікальны экзэмпляр перавыдадзенага "Слуцкага Евангелля", знакамітае выданне "Беларусы" Яўхіма Карскага ў трох тамах, кнігі, прысвечаныя 1150-годдзю Полацка, 600-годдзю Белавежскай пушчы і іншыя. Часам цана ўзлятала ў дзясяткі разоў. Напрыклад, кошт лоту "Беларускія дзіцячыя кнігі паэтэсы Наталлі Ігнаценкі", які прадаваўся з аўтографам аўтаркі і яе калядным вершам на прыгожай паштоўцы, вырас з 50 тысяч да трох мільёнаў рублёў — у 60 разоў.

Дарэчы, удзельнік аўкцыёну пад нумарам 6, што набыў гэтае і шэраг іншых выданняў, аказаўся чалавекам даволі вядомым: пісьменнік, мецэнат Анатоль Статкевіч-Чабаганаў. Пасля заканчэння аўкцыёну першы намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч запрасіла яго на сцэну. "Мы высока цэнім вас, паважаны Анатоль Васільевіч, за ўклад у кнігу, пашырэнне культуры чытання, што асабліва прыкметна ў апошнія гады. Прычым вельмі важна, што робіце вы заўсёды дабрачынныя справы — са шчырым сэрцам, з цеплынёй і любоўю," — сказала яна.

Чытачы "Голасу Радзімы" ведаюць, што пісьменнік стаў заснавальнікам серыі "Летапіс беларускай шляхты", яго кнігі займаюць ганаровыя месцы на прэстыжных айчынных і замежных конкурсах. За падтрымку кнігавыдання, бібліятэчнай справы, увогуле беларускай культуры Лілія Ананіч уручыла Анатолю Статкевічу-Чабаганаву дыплом "Мецэнат кнігі", падпісаны міністрам інфармацыі Беларусі.

Прымаючы ўзнагароду, пісьменнік заўважыў, што 2012-ы, Год кнігі стаў для яго ў некаторай ступені ўнікальным. Больш за 20 гадоў ён працуе над серыяй кніг пра старажытныя беларускія роды, сёлета пабачылі свет яшчэ два тамы. "Ужо 500 экзэмпляраў кніг "Я — сын Ваш" падарыў я Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, — казаў на ўрачыстасці дыпламант.— Спачатку там папрасілі 20 тамоў, адправілі анатацыі ў вядучыя бібліятэкі свету — і атрымалі вал запытанняў! І сто, і дзвесце экзэмпляраў аказалася мала. Кнігі пры дапамозе абмену адпраўляюцца з Мінска ў розныя бібліятэкі свету. Я вельмі ўдзячны супрацоўнікам Нацыянальнай бібліятэкі, яе дырэктару Раману Матульскаму за дапамогу: дзякуючы ў тым ліку і гэтым людзям гісторыю старажытных беларускіх родаў ведаюць чытачы розных краін". Нядаўна 100 тамоў каштоўнай кнігі аўтар падарыў Цэнтральнай бібліятэцы НАН Беларусі, і яшчэ сто — Любанскаму раёну, адкуль сам родам. Гэта было, расказваў пісьменнік, на ўрачыстасці ў раённым Доме мастацтваў: "Сабраліся ўсе бібліятэкары, ад іх я пачуў шмат цёплых, удзячных слоў, якія мяне вельмі ўсхвалявалі. А што кнігі запатрабаваныя, то вялікая радасць для мяне. Менавіта з любові да свайго роду і пачынаецца любоў да Айчыны. Памяць аб продках — гэта вельмі важна для развіцця як асобы, так і грамадства."

Усяго пад час дабрачыннага аўкцыёну выручана больш за 50 мільёнаў рублёў. Як паведамілі ў міністэрстве інфармацыі, большая частка грошай пойдзе на калядныя падарункі для выхаванцаў Гарадзішчанскага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіха-фізічнага развіцця. А "Вялікія Калядныя сустрэчы з кнігай" — так называецца ўсебеларуская акцыя — чакаюць усю краіну. Як сказала Лілія Ананіч, кніжны баль толькі адкрываў серыю такіх мерапрыемстваў. Пры падтрымцы Саюза пісьменнікаў Беларусі ў кнігарнях ужо праходзяць Калядныя сустрэчы з пісьменнікамі, кнігавыдаўцамі. Усіх пакупнікоў чакаюць кніжныя падарункі. "Увогуле, наша беларуская кніга — гэта па-ранейшаму цудоўны духоўны падарунак," — упэўнена Лілія Ананіч.

Іван Ждановіч. Друкаваныя скарбы растуць у цане